Мая Радзіма – Беларусь
Сінякова Дар’я Іванаўна
ДУА “Калінаўская сярэдняя школа
Дубровенскага раёна імя І. Д. Чарняхоўскага”
6 клас

Беларусь-мая маці і мова,
Паветра і хлеб.
А.Вялюгін.

Бацькаўшчына… Радзіма… Як мілагучна і прыгожа гучаць гэтыя словы! Якой любоўю і пяшчотай адгукаюцца яны ў сэрцы кожнага беларуса! Многія называюць гэта пачуццё патрыятызмам, і я лічу, што гэта любоў не толькі да тых мясцін, дзе я нарадзілася, але і да ўсяго краю, дзе спрадвеку жылі мае продкі, дзе нарадзіліся славутыя Ф.Скарына, Я.Купала, Я.Колас, М.Багановіч і многія іншыя, чые імёны назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю нашай Радзімы.

Кожны чалавек непасрэдна звязаны з зямлёю, на якой нарадзіўся. Так і мы, дзеці нашай мілай матулі-Беларусі, павінны ведаць, што краіна, у якой мы жывём, – гэта самы цудоўны падарунак лёсу, самае дарагое, што ў нас ёсць. Патрэбна толькі сэрцам адчуць еднасць з ёй, услухацца ў родны гоман шапатлівых лясоў, пачуць мілагучны спеў Дняпра і Дзвіны, Сожа і Прыпяці, адчуць тую сілу, якую можа даць чалавеку толькі родная зямля.

Такім куточкам для мяне з’яўляецца вёска Ляды, што на Дубровеншчыне. Цудоўныя краявіды, якія надоўга пакідаюць след у памяці. І палі, узгоркі, стрэхі хат – усё непаўторнае, толькі ляднянскае. Вёска Ляды мае свае адметнасці, знакамітая славутымі аднавяскоўцамі.

Мястэчка Ляды належыла князю Мікалаю Глябовічу. Праз яго праязджала імператрыца Кацярына ІІ і аўстрыйскі імператар Іосіф ІІ, ішоў разам са сваёй арміяй французскі імператар Напалеон. Гэта Радзіма мастака Сяргея Канстанцінавіча Заранкі (сапраўднае прозвішча Мікіцін). Сярод яго вучняў ─ В. Пяроў, У. Макоўскі, В. Пукіраў. У Дзяржаўным музеі Рэспублікі Беларусь размешчаны тры работы мастака.

Я ганаруся, што нарадзілася на гэтай цудоўнай зямлі, якая праз стагоддзі пранесла на сабе ўвесь цяжар болю і пакут, якія выпалі на яе лёс: частыя набегі з боку зайздраснікаў-суседзяў у сярэднія вякі, дзве Айчынныя і грамадзянская войны… Мой край перажыў страшныя пакуты ваеннага ліхалецця. Імёны землякоў, абаронцаў Радзімы, назаўсёды застануцца не толькі на абеліску ў цэнтры Лядоў, але і ў нашых сэрцах.

Першы дзень яўрэйскай Пасхі, другога красавіка тысяча дзевяцьсот сорак другога года – трагедыя вёскі Ляды. Усё яўрэйскае насельніцтва немцы сагналі ў супрацьтанкавы роў за ракой Мярэяй, дзе расстралялі, не шкадуючы, ні жанчын, ні дзяцей.

Мясцовыя жыхары ўспаміналі, што маленькіх дзяцей фашысты вырывалі з рук матуль, аб калена ламалі ім спіны і кідалі ў роў…

Больш за дзве тысячы чалавечых жыццяў былі жорстка знішчаны фашыстамі ў першыя гады вайны.

У свой час усе яны думалі, марылі, спадзяваліся і проста жылі… Але раптоўна ўсё скончылася. Вайна забрала і радасць, і шчасце, і весялосць.

Сэрца сціскае боль…

Мне пашчасціла, што я не бачала вайны, скалечаных дзяцей, слёз матуль.

Выпрабаванні не скарылі нашу Айчыну, яе працавітых і добрых людзей.

Беларусь мае добрую славу ва ўсім свеце. Яна звязана з велізарнымі пераўтварэннямі, што адбыліся ў краіне ў мірны час, з матэрыяльнымі і духоўнымі здабыткамі, якіх з кожным годам становіцца ўсё больш і больш.

Я жыву пад мірным небам і маю магчымасць любавацца роднымі краявідамі: блакітнымі доўгімі стужкамі рэк, бяздоннымі люстэркамі азёр, велічнымі лясамі і бясконцымі, шырокімі палямі. Для мяне няма на свеце лепшага куточка, чым мая родная Беларусь, якая надоўга пакідае светлы след у памяці кожнага, хто пабывае ў нашай краіне.

Ведаю, што да таго часу, пакуль кожны з нас будзе берагчы родныя традыцыі, шанаваць памяць продкаў, любіць родную прыроду, Беларусь застанецца свабоднай, яснай, чыстай, светлай краінай.

Зямля Беларусі! Ты ў граях-вяснянках,
Ты ў звоне вясёлак, ты ў гуслях вятроў,
Ты песня сама ад крыніц да заранкі,
Ад зорак паўночных да сіняга ранку,
Ты наша паэма з бурштынавых слоў!..

П.Броўка